ПАДАРЫЛА ДОМ УНУКУ

Мы з мужам у 1965 годзе пабудавалі дом. Выгадавалі траіх дзяцей і ўнука, які з двух гадоў застаўся без маці. Муж памёр у 2000 годзе, а дзеці раз'ехаліся. Я засталася адна. Часцей за ўсіх прыязджаў да мяне і дапамагаў унук. На сямейным савеце мы вырашылі, што я буду жыць у сваім доме пакуль змагу, а потым паеду да дачкі ў Гомель. Я хацела аформіць дом на дваіх — дачку і ўнука, але дачка не захацела афармляць на сябе нерухомасць. У 2004 годзе дом быў падораны ўнуку. Зямля тады на яго не афармлялася. З 2007 года ўнук знаходзіцца ў зняволенні. Дапамогі ад унука атрымаць я не магу, яшчэ і яму дапамагаць трэба. Я хачу вярнуць дом, каб надалей падарыць яго таму, хто мяне дагледзіць. Мне сказалі, што спачатку трэба аформіць зямлю. Унук даў даверанасць на куплю-продаж дома. Толькі я хацела б не прадаваць, а вярнуць назад свой дом. Як гэта зрабіць і ці патрэбна афармляць зямлю?

Н.Д., *Гомельская вобласць*

У адпаведнасці з артыкулам 549 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь дарыцель мае права адмяніць дарэнне, калі адорваемы здзейсніў пакушэнне на яго жыццё, жыццё каго-небудзь з членаў яго сям'і або блізкіх сваякоў ці наўмысна прычыніў дарыцелю цялесныя пашкоджанні. Калі ўнук нічога з пералічанага ў дачыненні да вас ці вашых блізкіх не зрабіў, то вы не можаце адмяніць дарэнне яму дома. Цяпер ён з'яўляецца ўласнікам дома і мае права ім распараджацца па сваім меркаванні, у тым ліку вырашаць — пакінуць яго ў сваёй уласнасці, каму-небудзь прадаць ці падарыць. Тое, што вы ўсе гэтыя гады плаціце за яго падатак на нерухомасць і страхоўку, не пазбаўляе ўнука права ўласнасці на дом.

З ліста вынікае, што ўнук вырашыў даць вам даверанасць на продаж дома ад яго імя таму, каго вы выбераце (магчыма, таму, хто вас дагледзіць). Вярнуць дом менавіта вам ён мог бы такім жа шляхам, як і атрымаў, гэта значыць — падарыць вам. Паколькі ён не на волі, для гэтага яму неабходна аформіць даверанасць на здзяйсненне дарэння з указаннем каму і што ён хоча падарыць (арт. 547 ГК). Толькі ў гэтым выпадку яго прадстаўніком па даверанасці павінен быць хтосьці іншы, а не вы, бо, згодна з артыкулам 183 ГК, прадстаўнік не можа здзяйсняць здзелкі ад імя таго, каго прадстаўляе ў дачыненні да сябе.

Перад тым як прадаваць ці дарыць дом, зямельны ўчастак, што выдзелены для абслугоўвання гэтага дома, павінен быць зарэгістраваны на ўласніка дома — унука (для гэтага зноў жа спатрэбіцца даверанасць).

Вызначана, што дзяржаўная рэгістрацыя пераходу права на будынак ажыццяўляецца адначасова з дзяржаўнай рэгістрацыяй пераходу права на зямельны ўчастак, на якім ён размешчаны (пункт 5 артыкула 10 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй», пункт 11 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў»).

Згодна з артыкулам 55 Кодэкса Рэспублікі Беларусь, пры пераходзе правоў на будынак да асобы, якая яго набыла, пераходзяць і правы на зямельны ўчастак. Пры гэтым не патрабуецца прыняцця дадатковага рашэння адпаведнага выканкама аб пераходзе права на зямельны ўчастак, калі пры гэтым не мяняецца яго мэтавае прызначэнне, від права на яго, памер і межы. У гэтым выпадку дзяржаўная рэгістрацыя пераходу права на зямельны ўчастак ажыццяўляецца на падставе дакументаў, па якіх адбыўся пераход права на будынак. У 2004 годзе з пераходам права на дом да вашага ўнука ў адпаведнасці з гэтым артыкулам перайшло і права на зямельны ўчастак, толькі гэта не было афармлена.

Цяпер, згодна з пунктам 7 Указа № 667 ад 27.12.2007 г. «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў», грамадзянін абавязаны на працягу двух месяцаў з дня ажыццяўлення здзелкі з нерухомай маёмасцю, якая цягне пераход да яго права на зямельны ўчастак для абслугоўвання гэтай маёмасці, звярнуцца па рэгістрацыю гэтага зямельнага ўчастка.

Калі б у 2004 годзе вы аформілі на дом завяшчанне на ўнука, а не дагавор дарэння, цяпер гэтых праблем не было б. Пры дарэнні дома права ўласнасці на яго пераходзіць да адорваемага ў момант дзяржаўнай рэгістрацыі дагавора дарэння. Па завяшчанні ж такое права спадчыннік набудзе толькі пасля смерці спадчынадаўца. Да таго ж, зробленае раней завяшчанне адмяніць або часткова змяніць не так складана, дастаткова толькі наведацца да натарыуса па месцы свай-

Сардэчна віншуем любімую жонку, дарагую матулю, клапатлівую бабулю і прабабулю ***МАРОЗ Дзіну Канстанцінаўну,*** *настаўніцу па жыцці і ў вялікай сям'і, з пачэсным 80-гадовым юбілеем! Зычым светлых сонечных дзён, здароўя і маладосці беларускай душы!*

Муж, дзеці, унукі, праўнукі.

ПУЦЁВАК СТАНЕ БОЛЬШ

Новы жылы корпус на 85 месцаў адчыніўся на турыстычнай базе «Высокі бераг», што знаходзіцца ў межах заказніка імя Якуба Коласа ў Стаўбцоўскім раёне. Пры гэтым, як паведаміла прэс-сакратар Федэрацыі прафсаюзаў Вольга Зуёнак, дадатковыя плошчы павінны змякчыць адну з найбольш вострых праблем апошняга часу — дэфіцыт пуцёвак.

Дарэчы, заўважыла Вольга Зуёнак, апроч новага корпуса, на базе «Высокага берага» адчыненыя летнія дамкі на 100, а таксама стацыянарны корпус на 50 месцаў. Дагэтуль тут маглі адпачыць больш за 6 тысяч чалавек у год.

Сяргей ГРЫБ.

ЧЫЯ КАНТРАБАНДА?

У пакінутых хатах вырабляюць гарэлку ці прыстасоўваюць іх пад сховішча кантрабанднага тавару. Наскочыць міліцыя, а гаспадара няма. Каго штрафаваць?

Вось і ў в. Ладарож Пінскага раёна міліцыянеры з памежнікамі зазірнулі ў нежылую хату, а там ляжаць 5 тысяч прывадных рамянёў для сельгастэхнікі.

Тавар коштам 75 млн рублёў забралі і цяпер шукаюць гаспадара.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Шануй сваё!

«Музы Нясвіжа-2009»: глядзім і слухаем беларускае

У той час, калі расійская Масква бударажылася выступленнямі еўрапейскіх поп-выканаўцаў Еўрабачання, беларускі Нясвіж патанаў у чароўных гуках еўрапейскай камернай музыкі. І не проста еўрапейскай, а з беларускім кантэкстам: большасць выкананых на фестывалі музычных шэдэўраў пісалася кампазітарамі пад уражаннем ад беларускай зямлі...

Іскрынкай сёлетняга XIV свята мастацтваў «Музы Нясвіжа-2009» сталі творы замежных і айчынных кампазітараў у кантэксце лучнасці беларускай і еўрапейскай музычнай культуры. Арыгінальныя аранжыроўкі да твораў былі выкананыя Нацыянальным канцэртным аркестрам Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Вось я, напрыклад, да сёлетняга фестывалю не ўяўляў, як можна творы Моцарта выконваць на трубе. Высвятляецца, можна. Ды і не толькі Моцарта.

Сотні ўзмахаў дырыжорскай палачкай, удыхаў флейтыстаў, кларнетыстаў і трубачоў, ашаламляльныя апладысменты. Гэта ўсё Нясвіж. Музычны Нясвіж узору 2009-га.

Беларускай фарбай па еўрапейскім палатне

«Асноўная дамінанта і ідэя сёлетняй асветніцкай акцыі — спрадвечная адкрытасць нясвіжскай культуры, арганіка яднання ў ёй мясцовага, лакальнага і агульнаеўрапейскага мастацкага пачаткаў». Ідэя, выказаная ў адмысловых праграмках фестывалю, на ўсе сто была абгрунтаваная на навукова-практычнай канферэнцыі «Музычная Беларусь: на скрыжаванні еўрапейскіх шляхоў», што адкрывала пятнічны дзень фестывалю.

«Нясвіжская асветніцкая імпрэза становіцца сінтэтычнай — яна так і была задуманая, — зазначыла **доктар мастацтвазнаўства Вольга ДАДЗІЁМАВА,** падводзячы вынікі навукова-практычнай канферэнцыі. — Гэты праект унікальны, і ўнікальнасць гэтая заключана ў беларусацэнтрычнай пазіцыі. Канферэнцыя таксама была цалкам прысвечаная беларускім рэаліям. І колькі б Беларусь ні была ў цэнтры музычнай Еўропы, музычнай Еўропе яна цікавая менавіта сваёй беларускасцю са сваімі непаўторнымі, унікальнымі, спецыфічнымі фарбамі, якія акумуляваны менавіта ў нясвіжскім асяроддзі, якое было заўсёды і мадэллю беларускай культуры, і яе візітоўкай на працягу многіх і многіх стагоддзяў (ад пачатку нотадрукаў; ад першай беларускай оперы, у якой упершыню ў свеце на сцэне з'явіліся сяляне, да сённяшняга часу, калі Нясвіж ізноў стаў той іскрынкай, зоркай на еўрапейскім і беларускім музычным небасхіле».

На канферэнцыі былі абмеркаваныя пытанні этнамузыкалогіі, музыкапісьмовых традыцый, старадаўняй і сучаснай музыкі, музыкі рэлігійнай і свецкай, нават пытанні тэлерадыёкамунікацыі. «Такое ўражанне, — падзялілася Вольга Дадзіёмава, — што гэта канферэнцыя сталася мадэллю даследчыцкага беларускага свету».

Нясвіж — беларуская зорка на еўрапейскім небасхіле

Багаты на традыцыі Нясвіж з'яўляецца значным культурным цэнтрам не толькі ў Беларусі, знакамітасць ён набывае і ў астатнім свеце.

«Горад быў праслаўлены яшчэ Радзівілаўскай дынастыяй, дзякуючы чаму мы з вамі зараз знаходзімся ў горадзе, які мае статус сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, — зазначыў падчас прэс-канферэнцыі **намеснік міністра культуры Уладзімір ГРЫДЗЮШКА.** — На працягу многіх стагоддзяў тут, у Нясвіжы, гучала музыка. І той факт, што сёлета мы зноў маем тут фестываль, сведчыць пра тое, што ў культуры і мастацтве ёсць пераемнасць. І гэту пераемнасць разам са сваім аркестрам забяспечвае Міхаіл Якаўлевіч Фінберг. Хоць фестываль і праходзіць у невялікім горадзе, але ён ужо мае статус і абласнога, і рэспубліканскага фестывалю».

«Чатырнаццаты год запар мы працуем на фестывалі «Музы Нясвіжа», і гэта той вынік, які павінен быць у нашай дзяржаве, — падкрэсліў **народны артыст Беларусі Міхаіл ФІНБЕРГ.** — За гэтыя гады мы зрабілі шмат праграм, няма такога беларускага кампазітара XVII-XX стагоддзяў, якога б мы тут, у Нясвіжы, не выканалі. Таму ў гэтым годзе мы перайшлі на новы фармат: мы павярнуліся ў Еўропу. І сёлета на фестывалі ўпершыню прагучаць не толькі творы, якія нарадзіліся ў Нясвіжы, але і тыя, якія пад уздзеяннем першых стваралісяі распаўсюджваліся ў Еўропе. Мы зрабілі вялікую справу. І тут заслуга як нас, арганізатараў, так і СМІ, бо ўсе гэтыя 14 гадоў мы працавалі разам вельмі плённа. Спадзяюся, разам мы будзем працаваць і надалей, каб нашу беларускую музыку, наша беларускае слова ведалі не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце. Слухайце беларускае!»

«Мастацтва яднае прадстаўнікоў усіх пакаленняў і ўсіх нацыянальнасцяў, — упэўнены **старшыня Нясвіжскага райвыканкама Ігар МАКАР.** — З кожным годам аўтарытэт гэтага свята пашыраецца. І мясцовая ўлада робіць усё, каб нашы госці заўсёды хацелі зноў вярнуцца да нас».

Ігар Макар адзначыў, што 2008 год стаў для раённага цэнтра як ніколі плённым. Найбольш было зроблена ў сацыяльным плане: здадзены ў эксплуатацыю фізкультурна-аздараўленчы цэнтр у парку князёў Радзівілаў, пабудаваны раённы ліцэй для таленавітых дзяцей — будынак раённай бібліятэкі, адчынены палацава-замкавы комплекс князёў Радзівілаў. Адраманцтавалі цэнтральную раённую бальніцу, пачаў сваю працу медыцынскі цэнтр па гемадыялізе, вядзецца актыўнае будаўніцтва жылля...

Мы — дзеці еўрапейскай музычнай культуры

«Нясвіж заўсёды быў не толькі цэнтрам, але і ў цэнтры еўрапейскага ўзроўню, — зазначыла падчас урачыстага адкрыцця XIV свята мастацтваў «Музы Нясвіжа-2009» Вольга Дадзіёмава. — Мы не схільныя ідэалізаваць еўрапейскі свет і еўрапейскую цывілізацыю. Шчыра кажучы, яна мае шмат супярэчнасцяў, яна мае шмат трагічных старонак. І сёлета, калі мы адзначаем 65-годдзе вызвалення Беларусі, мы памятаем гэта як ніколі. Усё ж мы — дзеці еўрапейскай музычнай культуры з характэрнымі для яе якасцямі, з універсальнасцю і разам з тым разнастайнасцю, багаццем рэгіянальных праяў, з высокім узлётам кампазітарскага генія ў вышынях мастацкай творчасці, з паслядоўнай зменай музычных эпох: ад Рэнесансу і барока да традыцыяналізму і рамантызму. Многае з гэтага тут ужо дэманстравалася, таму мы вырашылі паказаць вам сённяшні Нясвіж, які застаецца ў цэнтры музычнай Еўропы: тут гучыць музыка заходнееўрапейскіх, рускіх, беларускіх майстроў і дэманструецца калектывам еўрапейскага ўзроўню».

Гучалі музычныя творы Яўгена Глебава, Генрыха Вагнера, Мікалая Чуркіна. Гэтак жа, як і творы Мацея Радзівіла, Мечыслава Карловіча, Міхаіла Глінкі іх творы здольныя падняць у паветра і даць крылы. Тут і палёт, і сон, і фантазія адначасова, у дадатак можна пачуць нават песні жаўрука і сініцы... Казачныя адчуванні! Тое ж і з творамі сусветна вядомых Міхала Клеафаса Агінскага, Яна Холанда, Станіслава Манюшкі, Напалеона Орды і многіх іншых. Музыка дае не толькі крылы, яна таксама дае і фарбы.

Фота БЕЛТА.

Струнны квартэт «Нацыянальнага канцэртнага аркестру Беларусі.

Нацыянальны аркестр Беларусі ўмее маляваць музыкай...

Напрыканцы

Трэцяя музычная асамблея «Беларуская выканальніцкая школа на струнных інструментах», якая распачалася ў суботу ў гарадской ратушы, стала працягам традыцыі папярэдніх гадоў фестывалю (раней ужо праходзілі асамблея па драўляных і медных інструментах). Асамблея дапамагла прасачыць развіццё струннага майстэрства беларускіх музыкаў. Шмат гаварылася і дэманстравалася ў галіне сучасных дасягненняў струннай музыкі Беларусі. Адмысловым удзельнікам асамблеі стаў струнны квартэт Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі.

А суботнім вечарам у мясцовым РДК Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам прафесара Міхаіла Фінберга зрабіў несвіжанам сапраўдны падарунак — канцэртную праграму «Лепшыя песні — табе, Нясвіж!», творы ў складзе якой выконвалі салісты нацыянальнага аркестра Г. Благава, Л. Грыбалёва, Н. Тамела, С. Нэма, Р. Мусвідас і інш.

* * *

Сярод гасцей фестывалю быў таксама і саветнік Італіі пры Міністэрстве культуры Беларусі Эўджэніа Кваранціэлі.

— Я ўпершыню ў Нясвіжы, — гаворыць Эўджэніа. — І, кажучы шчыра, быў уражаны той праграмай фестывалю, якая была прэзентавана ў такім невялічкім горадзе. Таксама радуе той музычны матэрыял, які, як я чуў, абнаўляецца з кожным годам. У Італіі таксама праводзіцца вельмі шмат музычных фестываляў, асабліва летам. І ўсе вельмі розныя. Адметнасць беларускага Нясвіжа ў тым, што менавіта тут, у гэтым маленькім горадзе Беларусі, падрыхтаваная такая моцная праграма.

Натхнёнаму нясвіжскай музай, мне ніяк не хацелася ўсведамляць, што XIV свята мастацтваў «Музы Нясвіжа-2009» скончылася. І слухачы разышліся, і музыкі раз'ехаліся. Але калі прыслухацца, у паветры яшчэ можна пачуць узмахі дырыжорскай палачкі, апладысменты і... творы Моцарта, якога іграюць на трубе.

Але я ўжо не здзіўляюся. Сваё здзіўленне прыхаваю да наступнага разу — юбілейны, XV фестываль ужо сёння абяцае шмат цікавага, гэтаксама як і Нясвіж узору 2010-га.

Ілья ЛАПАТО.

Векавечнае

Легендарнае Слуцкае Евангелле вяртаецца на гістарычную радзіму

Упершыню за пасляваенную гісторыю Случчыны 22, 23 і 24 мая ў Слуцкім краязнаўчым музеі жыхарам і гасцям горада будзе прадэманстравана Слуцкае Евангелле XVI стагоддзя, уласнаручна перапісанае ў 1580—82 гадах для Слуцкага Свята-Троіцкага манастыра слуцкім князем Юрыем Юр'евічам Алелькавічам, бацькам святой праведнай Сафіі Слуцкай.

Вяртанне святыні

Лёс гэтай кнігі сапраўды загадкавы. У 1582 годзе кніга разам з настаяцельскім посахам і сярэбраным пацірам была перададзеная ў дар Свята-Троіцкаму манастыру князем Юрыем Алелькавічам, дзе яна і знаходзілася да 20-х гадоў XX стагоддзя. Калі манастыр закрылі, Евангелле было перададзенае на захаванне Слуцкаму краязнаўчаму музею. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ўнікальны рукапіс разам з іншымі каштоўнымі экспанатамі перавезены ў Мінск, а затым у Магілёў. У пачатку вайны ён бясследна знікае з браніравання пакоя Магілёўскага дзяржаўнага музея разам з іншымі беларускімі каштоўнасцямі, у ліку якіх Крыж вялебнай Ефрасінні Полацкай. І толькі 12 чэрвеня 2003 года на Епархіяльных чытаннях, прысвечаных 210-годдзю мінскай Епархіі, было аб'яўлена, што ўнікальны рукапіс знойдзены. Яго паказаў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. Як высветлілася, Слуцкае Евангелле XVI стагоддзя захоўвала ў сябе адна сталічная жыхарка. Яна, відавочна, не ўяўляла, якая гэта каштоўная рэч. Жанчыне яна дасталася ў спадчыну. А калі святар адслужыў адпяванне сваяка гэтай прыхаджанкі, яна ў знак падзякі падарыла яму праваслаўную святыню. Так мы зноў набылі гэтую ўнікальную гістарычную і духоўную каштоўнасць, і цяпер яна захоўваецца ў Дамавым храме ў гонар Сабора беларускіх святых.

Між тым некаторыя даследчыкі перакананыя: вяртанне Слуцкага Евангелля павышае шанцы знайсці Крыж Ефрасінні Полацкай. Паколькі гэтыя два рарытэты зніклі разам, зусім магчыма, што разам яны і захоўваліся — хоць бы некаторы час.

Слуцкае Евангелле напісана на царкоўна-славянскай мове на 263 старонках у дзве калонкі па 20 радкоў карычневым чарнілам з выкарыстаннем кінавары і золата. Застаўкі і многія літары ўпрыгожаныя геаметрычным і раслінным арнаментам. Гэтая кніга служыць запаветам слуцкага князя Юрыя Алелькавіча сваім нашчадкам.



«Ноч» у Слуцку!

Акрамя рукапісу, на выставе ў Слуцкім краязнаўчым музеі гэтымі днямі можна будзе ўбачыць шмат іншых каштоўных рарытэтаў, сярод якіх старадрукаваныя выданні, абразы і іншае. Частку экспанатаў выдасць са сваіх фондаў Слуцкі краязнаўчы музей, а частку — Музей старажытнай беларускай культуры Акадэміі навук Беларусі.

Супрацоўнікі музея запрашаюць усіх случчан і гасцей горада наведаць унікальную ў сваім родзе выставу. Пачатак мерапрыемства 22 мая ў 18.00 на плошчы Слуцкага краязнаўчага музея. У гэты дзень у рамках акцыі, прысвечанай Міжнароднаму дню музея, дзверы захавальніка слуцкай гісторыі будуць адкрытыя для ўсіх да 24.00, а ў выхадныя дні, 23 і 24 мая, выстава будзе доўжыцца з 10.00 да 18.00.

Васіль ЦІШКЕВІЧ,
навуковы супрацоўнік
Слуцкага краязнаўчага музея.

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На бягучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

20 мая — генеральны дырэктар РУП «Фармацыя» Ігар Яўгенавіч КАВАЛЬЧУК.

21 мая — намеснік дырэктара РНПЦ «Кардыялогія» Аляксандр Рыгоравіч БУЛГАК.

22 мая — галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Аляксандр Мікалаевіч БАРСУКОЎ.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

20 мая — намеснік галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Аксана Уладзіміраўна ЗАРОДАВА.

21 мая — загадчык нефралагічнага аддзялення Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Таццяна Аляксандраўна КАВАЛЕЎСКАЯ.

22 мая — загадчык хірургічнага аддзялення №2 Мінскай абласной клінічнай бальніцы С.В. АЛЯКСАНДРАЎ.

ВІНАВАТЫ ДОМ КУЛЬТУРЫ?

У в. Мястковічы Пінскага раёна ёсць Дом культуры і гэты факт, відавочна, дужа непакоіў мясцовага жыхара. Сярод белага дня ён пачаў біць вокны ў будынку, дзе можна адпачыць. 28-гадовага беспрацоўнага міліцыя затрымала.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Нічога асабістага!

Не падкажаце, як прайсці ў бібліятэку?

З нядаўняга часу я бібліятэкі не люблю. Раней было неяк па-іншаму. Ці то я быў маладзейшы, ці то бібліятэкі былі дабрэйшыя. Памятаю, у школе часта ў бібліятэку лазілі — то энцыклапедыю якую з малюнкамі пагартаць, то сярод палічак з разумнымі кніжкамі паблукаць... Бібліятэка ўспрымалася як нейкі храм, а бібліятэкар — як вартаўнік ведаў, і калі яго задобрыць, то ён можа табе падсунуць самую-самую цікавую кніжку.

А цяпер як пераклініла. Не хачу хадзіць у бібліятэкі і ўсё! Прачытаю кніжку ў Інтэрнэце, набуду ў краме, пазычу ў сяброў, але толькі не пайду ў бібліятэку. Чаму? А хто яго ведае... Па-першае, я не магу чытаць кніжкі па календары, бо для кожнай кніжкі павінен быць адпаведны настрой. А бібліятэкар заўсёды ставіць «прысуд» на кожнай кнізе: «вярнуць да пэўнага дня». І ты ходзіш і думаеш: «абы толькі не пратэрмінаваць». І, як на ліха, абавязкова не паспееш: то часу ў бібліятэку завітаць няма, то кніжку з сабой не возьмеш, то ў бібліятэцы санітарны дзень...

Па-другое, можа, мне не шанцуе, а можа, гэта тэндэнцыя, але ў бібліятэках абавязкова патрэбная табе «пазарэз» кніга будзе на руках. Крыўдна, безумоўна, але аднойчы ў мяне была гісторыя ні то анекдатычная, ні то маразматычная. Прыходжу ў факультэцкую бібліятэку. І прашу падручнік, па якім трэба рыхтавацца да кантрольнай. Прыйшоў я самы апошні з групы, таму мне кажуць, што такія кніжкі ўжо ўсё разабралі. Я толькі пачаў засмучацца, ажно бачу — стаіць патрэбны мне падручнік на самым бачным месцы на стэндзе пад шыльдачкай «Новыя паступленні літаратуры». Ну думаю, пашанцавала! І кажу:

— А вунь жа ў вас экзэмплярчык застаўся, запішыце яго на мяне!

— Не-не! — чую ў адказ. — Нельга! Гэта выставачны экзэмпляр, на рукі яго не даём!..

Я, вядома ж, паспрабаваў абмеркаваць з бібліятэкаркай парадокс адначасовай наяўнасці і адсутнасці кніжак у бібліятэцы, а таксама карысці ад стэнда з новымі паступленнямі, але так і пайшоў шылам гарачай кашы ўхапіўшы...

Ці во днямі падаўся ў галоўную бібліятэку матэрыялы для курсавой працы шукаць. А там, з аднаго боку, канапы мяккія і гарбата ў буфеце танная, а з іншага боку — свае законы: з фотаапаратам не хадзі, торбу з сабой не бяры... Мне ж нашмат зручней прыйсці, сфатаграфаваць патрэбныя старонкі кніг, скінуць іх сабе на камп'ютар і ўжо дома спакойненька з імі працаваць. Дык не! Цягайся кожны дзень у бібліятэку... Забарону на фатаграфаванне супрацоўнікі бібліятэкі тлумачаць абаронай аўтарскіх правоў і іншымі добрымі справамі а-ля «перавод бабулі цераз дарогу». Можа яно і так, але сама бібліятэка аказвае паслугі ксеракопіі, дый наогул, калі вельмі захочацца нешта сплагіяціць, я і ад рукі перапісаць магу...

А яшчэ задумаўся пасля наведвання залы дысертацый. Аказваецца, каб прачытаць нечыю дысертацыю, трэба прынесці паперку на афіцыйным бланку ад універсітэта ці іншай навучальнай установы з «чалабітнай»: маўляў, будзьце ласкавыя, дазвольце пасядзець у вас ды разумныя тэксты пачытаць. Мне што — схадзіў на факультэт і прынёс гэтую бюракратыю. Але вось я над чым задумаўся: калі б я працаваў якім-небудзь токарам, але вельмі цікавіўся б пэўнай тэмай. Перарыў усе кніжкі, Інтэрнэт, і захацелася мне яшчэ пачытаць, што піша на гэты конт наша інтэлігенцыя. Прыйшоў бы я ў залу дысертацый — а паперкі ў мяне і няма. І ўзяць няма дзе. Хіба што ісці да брыгадзіра і казаць: «Напішы-ка ты мне, Пятровіч, што я чалавек добры і што ні разу не шпіён»... Мо і павераць. Я ж спадзяюся, што ў нас яшчэ не народ для бібліятэк, а бібліятэкі для народа.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Антыкрызісная эканоміка: погляд

Распродаж. Ёсць пытанні

Распродаж тавараў шырока практыкуецца ва ўсім свеце. На прылаўкі выкладаецца тое, што заляжалася і не мае попыту. Людзі з вечара займаюць чаргу, каб раніцай уварвацца ў нейкі супермаркет і загрузіцца «пад завязку». А чаму ў нас распродажы яшчэ не прыцягваюць пакупнікоў?

На Брэстчыне праходзіць месячнік распродажу тавараў беларускай вытворчасці, найперш прадукцыі лёгкай прамысловасці. Менавіта на складах гэтай галіны найбольшыя запасы незапатрабаваных тавараў. Але да гэтага пытання мы вернемся крыху ніжэй.

Часам лаўлю сябе на думцы: чаму ў нас нейкае добрае пачынанне, узнятае ў сталіцы, раскручваецца бурна, а затым на перыферыі заціхае непрыкметна? Я не буду гаварыць пра «адно акно» ці Кнігу скаргаў і прапаноў, а звярну ўвагу на акцыю «Купляйце беларускае».

Праблема надзвычай актуальная і яна датычыцца органаў улады, кіраўнікоў прадпрыемстваў, гандлю... А прыцягнуць увагу насельніцтва, зыходзячы з сусветнай практыкі, можна зніжэннем кошту прадукцыі, яе якасцю, дадатковымі паслугамі... Хоць і гучыць гэта банальна, але іншага шляху да пакупніка няма.

Па дарозе з цэнтральнага рынку ў Баранавічах маю ўвагу прыцягнуў плакат, які заклікаў купляць беларускае. Калі пад гэты заклік не паленаваліся расфарбаваць усю браму, то як было не зайсці ў гандлёвы цэнтр «Алюр», каб паглядзець, што там з беларускай прадукцыі прапануецца. Зайшоў — і адразу ў аддзел, у якім прадаюцца мыйныя сродкі. Спытаў у прадаўшчыцы, ці ёсць у іх прадукцыя «Бархіма». Аказалася, што нічога няма, а спрэс імпартныя парашкі.

У зале бытавой тэхнікі пральная машына і халадзільнік фірмы «Атлант» згубіліся сярод аналагічнай замежнай прадукцыі.

Калі вы запрашаеце купляць беларускае, то, напэўна, трэба растлумачыць пакупніку, чаму наша пральная машына не горшая за імпартную, напрыклад «LG», якая стаіць побач з «Атлантам».

А хто будзе непасрэдна працаваць з пакупніком? Вытворцы? Прадаўцы? А то павесілі ў крамах шыльдачкі «Купляйце беларускае» і лічаць, што прыцягнулі ўвагу спажыўцоў. А патрэбна нешта большае.

У даваеннай Польшчы быў перыяд, калі заклікалі насельніцтва купляць тавары ў палякаў, а не ў яўрэяў. Нават выстаўлялі каля крамаў апошніх пікеты. Але з гэтага нічога не атрымалася. Ва ўсіх яўрэйскіх крамах знізілася цана, тавар пачалі адпускаць у крэдыт: «Пане, бярыце, аддасцё грошы, калі будуць», — угаворваў пакупніка гаспадар крамы. Такое давялося чуць ад старых людзей, якія ў той час заходзілі ў тыя крамы.

Гандаль, ды і вытворчасць пры рынкавых адносінах патрабуюць жывога падыходу.

Тое ж самае і з распродажам тавараў. Размова ідзе пра заляжалую прадукцыю. Тут мы не будзем гаварыць, чаму яна гадамі накоплівалася на прадпрыемствах, якія тым не меней банкрутамі не станавіліся, а атрымлівалі ўсё новыя датацыі. За лепшае будзе ўдзяліць увагу працэсу распродажу.

На складах Баранавіцкай швейнай фабрыкі «Бараўчанка» накапіўся трохмесячны запас прадукцыі, што прыкладна пацягне на 1,4 мільярда рублёў. Для такога невялікага прадпрыемства гэта многа. На распродажы кошт адзення, якое выпускалася 3-4 гады таму, зніжаны на 20 працэнтаў, а выпуску 2007 года — усяго на 10 працэнтаў.

Я зайшоў у краму «Алеся» швейнай фабрыкі і ўбачыў калекцыю дзіцячага адзення, на якім вісела шыльдачка «Распродаж». Тыя некалькі дзясяткаў цёмных касцюмчыкаў і бясплатна нікому не патрэбныя. Зразумела, што адзенне, якое не купілі ў год выпуску, праз чатыры гады наўрад ці хто купіць. Вось чаму распродаж неабходна наладжваць не адкладваючы, як толькі становіцца зразумела, што мадэлі не карыстаюцца попытам, а не рабіць гэта праз некалькі гадоў.

На Баранавіцкім баваўняным аб'яднанні на складах ляжыць тканіны на 25 мільярдаў рублёў і ўцэнка на распродажы складае ў сярэднім усяго 8 працэнтаў. У гандлёвым доме «Вясёлка» тканіны аб'яднання павінны выставіць толькі пасля 16 мая, але з прадукцыяй прадпрыемства можна пазнаёміцца і ў спецыялізаваным краме «Навінка».

Падкрэслю, што баваўняныя тканіны «ББПА» вельмі высокай якасці і значна лепшыя за расійскія, але яны і больш дарагія, а гэты фактар часта насцярожвае пакупніка.

Людзям неабходна ўсё растлумачыць, альбо адмаўляцца ад старых ДАСТаў і вырабляць танную тканіну ў страту якасці. Але і тады сітуацыя істотна не зменіцца, бо неабходна збыць назапашанае.

Распродаж — гэта, найперш, істотнае зніжэнне кошту тавару. Заходні пакупнік спяшаецца на распродаж, бо зніжкі там дасягаюць 50-80 працэнтаў ці цана на тавар падае ў некалькі разоў. Галоўнае — вярнуць хоць нейкія грошы.

Каб у нас такое было магчыма, то склады прадпрыемстваў імгненна апусцелі б. Наша насельніцтва таксама з вечара займала б чэргі, каб трапіць на такі распродаж.

А кіраўнікі прадпрыемстваў асабліва і не спадзяюцца, што распродаж нейкім чынам паўплывае на сітуацыю з заляжалай прадукцыяй. Склады перапоўненыя, а зніжкі на тавар нязначныя.

Многае завязана на форме ўласнасці. Прыватнік са сваім таварам можа манеўраваць і прадаваць па цане, якую палічыць прымальнай, ды хоць бясплатна раздаваць — свая рука ўладыка. Дзяржаўнае прадпрыемства не мае магчымасці для такога манеўру. Хто вінаваты, што выпушчаная калекцыя адзення нікому не патрэбная? Кіраўніцтва фабрыкі да гэтага мае прамое дачыненне. А цяпер застаецца толькі за бясцэнак аддаць выраблене? Хоць іншага выйсця, напэўна, і няма. Было б прадпрыемства прыватнае, то гаспадар даўно вылецеў бы ў трубу ці дзесяць разоў узважыў бы, якую прадукцыю выпускаць. А дзяржаўнае ў які раз прыходзіцца выратоўваць — даваць крэдыты. І робіцца гэта найчасцей, каб захаваць прадпрыемства, каб у людзей была праца, хоць іншым разам за лепшае было б закрыць прадпрыемства, бо яно ператвараецца ў прадонне, у якім знікаюць народныя грошы.

Крызіс у той ці іншай форме закрануў розныя прадпрыемствы, але тыя, дзе склады заваленыя незапатрабаванай прадукцыяй, знаходзяцца ў крызісе не адзін год.

Трэба ўлічваць, што сёння існуюць і магутныя ўплывовыя групоўкі, якія маюць вялікія барышы на пастаўках імпартнай прадукцыі, і для іх беларуская — як бяльмо ў воку.

Але ж гэта выдаткі рынку: канкурэнцыя — неад'емная частка яго. І кожная краіна імкнецца абараніць сваю эканоміку, а наколькі гэта бывае эфектыўна, залежыць і ад умення рэалізаваць прадукцыю сваіх прадпрыемстваў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ,
фота аўтара.

Крымінал, здарэнні

НЕ ХАПАЛА НА ЖЫЦЦЁ?

Карову з мясцовай гаспадаркі выкралі 44-гадовы галоўны ветэрынарны ўрач і 54-гадовы брыгадзір малочнатаварнай фермы Лельчыцкага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Зара Палесся», скарыстаўшыся сваімі службовымі паўнамоцтвамі. Цяпер суд можа даць ім за гэта зл